Смерць нямецкім акупантам!

# Чырвоная Звязда

ОРГАН БАРАНАВІЦКАГА АБЛАСНОГА КАМІТЭТА КП(б) БЕЛАРУСІ

№ 23 (229) Субота, 8 красавіка 1944 г.

„Прачытай і перадай другому"

## На поўнач ад Раздзельная нашымі войскамі акружана і знішчаецца значная групіроўка нямецкіх войск, састаячая з астаткаў 5-6 дывізій.

За 6 і 7 красавіка немцы ў гэтым раёне пакінулі на полі бою больш 5.000 трупаў. Узята ў палон 1.000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

# Заявление Советского Правительства

Вечером 2 апреля Народный Комиссар Иностранных Дел СССР тов. В. М. МОЛОТОВ пригласил представителей советской и иностранной печати и сделал от имени Советского Правительства следующее заявление:

Красная Армия, в результате успешного продвижения вперед, вышла на реку Прут, являющуюся государственной границей между СССР и Румынией. Этим положено начало полного восстановления советской государственной границы, установленной в 1940 году договором между Советским Союзом и Румынией, вероломно нарушенным в 1941 году румынским правительством в союзе с гитлеровской Германией. В настоящее время Красная Армия производит очищение советской территории от всех находящихся на ней вражеских войск, и уже не далеко то время, когда вся советская граница с Румынией будет полностью восстановлена.

Советское Правительство доводит до сведения, что наступающие части Красной Армии, преследуя германские армии и союзные с ними румынские войска, перешли на нескольких участках реку Прут и вступили на румынскую территорию. Верховным Главнокомандованием Красной Армии дан приказ советским наступающим частям преследовать врага вплоть до его разгрома и капитуляции.

Вместе с тем, Советское Правительство заявляет, что **оно не преследует цели приобретения какой-либо части румынской территории или изменения существующего общественного строя Румынии** и что вступление советских войск в пределы Румынии диктуется **исключительно военной необходимостью** и продолжающимся сопротовлением войск противника.

## К. В. КІСЯЛЁЎ—НАРОДНЫ КАМІСАР ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. Кузьма Венедзіктавіч КІСЯЛЁЎ прызначан Народным Камісарам Замежных Спраў Беларускай ССР.

## *На франтах Айчыннай вайны*

(З аператыўных зводак Совінформбюро за 4—7 красавіка)

На захад і паўднёвы захад ад горада Дубна нашы войскі вялі наступальныя баі, у ходзе якіх авалодалі райцэнтрамі Валынскай області горадам ГАРОХАЎ, горадам БЕРАСТЭЧКА, райцэнтрам Львоўскай області ЛАПАЦІН, а таксама занялі больш 120 другіх насельных пунктаў.

Нашы войскі, блакіруючыя горад Тарнопаль, вялі паспяховыя баі па знішчэнню акружанага гарнізона праціўніка і авалодалі большай часткай горада. За тры дні вулічных баёў знішчана больш 3 тыс. нямецкіх салдат і афіцэраў. Узята ў палон больш 300 немцаў.

Войскі 1-га Украінскага фронта прадаўжалі весці баі па знішчэнню акружанай групіроўкі праціўніка ў раёне Скала і авалодалі радам важных апорных пунктаў абароны немцаў. Праціўнік нясе велізарныя страты ў жывой сіле і тэхніцы. Толькі ў баях за 6 красавіка ў гэтым раёне нашымі войскамі знішчана больш 4 тыс. нямецкіх салдат і афіцэраў і захоплены багатыя трафеі, у тым ліку 5 транспартных самалётаў, 17 гармат рознага калібра, 7 танкаў, 1400 аўтамашын і др. На паўднёвы захад ад Тарнопаля нашы войскі адбівалі атакі буйных сіл танкаў і пяхоты праціўніка, спрабаваўшых прабіцца на дапамогу да акружанай групіроўкі.

На поўдзень ад горада Каменец-Падольскі нашы войскі, пасля трохдзённых упорных

(Працяг на 2-й стар.)

## На франтах Айчыннай вайны

(Пачатак на 1-й стар.)

баёў, авалодалі райцэнтрам Чэрнавіцкай абласці горадам ХОЦІН.

**На Кішэнёўскім** напрамку нашы войскі прадаўжалі весці наступальныя баі, у ходзе якіх авалодалі райцэнтрамі Малдаўскай ССР КІРПІЧЭНЫ, СУСЛАНЫ, уездным цэнтрам Малдаўскай ССР горадам ОРГІЕЎ — важным апорным пунктам абароны немцаў на подступах да Кішэнёва, а таксама занялі больш 60 другіх насельных пунктаў.

**На Адэскім** напрамку нашы войскі, прадаўжаючы развіваць наступленне, авалодалі райцэнтрамі Адэскай абласці ФРУНЗЕЎКА, ЦЭБРЫКАВА, ГРАСУЛАВА, БЕЛЯЕЎКА, ЯНАЎКА, АНТОНА-КАДЗІНЦАВА, а таксама з баямі занялі больш 310 другіх насельных пунктаў, у тым ліку Карсталь (28 км. на паўночны захад ад Адэсы) і Дафінаўка (16 км. на паўночны ўсход ад Адэсы). 5 красавіка нашы войскі авалодалі горадам і буйным чыгуначным вузлом РАЗДЗЕЛЬНАЯ — важным апорным пунктам абароны немцаў на подступах да Адэсы, адрэзаўшы тым самым асноўныя шляхі адходу ў Румынію адэскай групіроўцы праціўніка. Па няпоўным даным пры авалоданні Раздзельная нашымі войскамі захоплены наступныя трафеі: гармат 44, паравозаў 17, вагонаў з вайсковым грузам 500, складаў 3, чыгуначных эшалонаў 6, з іх 1 эшалон з гарматамі і танкамі і 2 эшалоны з раненымі нямецкімі салдатамі і афіцэрамі. На станцыі Вясёлы Кут нашымі войскамі захоплена 1100 вагонаў з рознай маёмасцю, з іх 74 вагоны са снарадамі, 31 вагон з авіябомбамі.

На поўнач ад Раздзельная нашымі войскамі акружана і знішчаецца значная група нямецкіх войск, састаячая з астаткаў 5-6 дывізій. За 6 і 7 красавіка немцы ў гэтым раёне пакінулі на полі бою больш 5000 трупаў. Узята ў палон 1000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Баранавіцкія партызаны знішчаюць жывую сілу і тэхніку ворага

## РАЗГРАМІЛІ БАТАЛЬЕН СС

...У распалажэнне варожага гарнізона партызаны ўварваліся раптоўна і смела. Гітлераўцы аказалі яраснае супраціўленне. Апорныя пункты праціўніка вялі знішчальны агонь. Але сіла баявога парыву народных мсціўцаў была мацней свінцовага дажджу і варожых дзотаў. Тоўстыя земляныя насыпі не ўкрылі гітлераўскіх забойцаў ад бязлітаснай і справядлівай народнай кары. З крыкамі «ура» партызаны атакавалі ворага. У акопах, дзотах і казармах завязаліся рукапашныя схваткі. У паўтарагадзінным упорным баю супраціўленне варожага гарнізона было зломлена...

Умелым і смелым ударам партызаны пад камандаваннем тав. М. поўнасцю разгрмілі 1-шы батальён остмусульманскай дывізіі СС, налічваўшы 600 чалавек, сярод якіх значная колькасць была немцаў. У баю знішчана больш 100 гітлераўцаў. У ліку забітых камандзір палка СС капітан Білік і многа другіх афіцэраў. Узята ў палон 112 чалавек. Партызаны захапілі трафеі, сярод якіх 48 вінтовак, некалькі кулямётаў і аўтаматаў, многа гранат, патронаў і другой вайсковай маёмасці. Спалены штаб палка, штаб батальёна, казармы і вайсковыя склады. Г.

## ПАД АДКОС...

Па важнай чыгуначнай магістралі немцы перакідвалі на фронт мота-механізіраванную часць. Група падрыўнікоў атрада імені Октября, пад камандаваннем тав. Ивана В., атрымала заданне перашкодзіць планамернаму прасоўванню нямецкіх эшалонаў...

У першую ноч група тав. В. замініравала палатно чыгункі і спусціла пад адкос паравоз і 29 вагонаў з жывой сілай і тэхнікай ворага. 16 вагонаў згарэла, 13 ўшчэнт разбіта. У ліку знішчаных было 9 вагонаў з жывой сілай. У агні згарэла 13 бронемашын і аўтамашын, 14 кулямётаў, вялікая колькасць вінтовак, гранат, патронаў і другой вайсковай маёмасці. У рэзультаце крушэння забіта 109 гітлераўскіх салдат і афіцэраў і 57 паранена.

Праз некалькі дзён тав. В. са сваёй групай узарваў яшчэ адзін варожы эшалон. На гэты раз пад адкос паляцелі 3 вагоны з жывой сілай. Забіта і паранена больш 100 нямецкіх салдат і афіцэраў.

ЗА ГРАНИЦЕЙ

## Налеты авиации союзников на Румынию и Венгрию

Специальный корреспондент агентства Рейтер пры главном штабе войск союзников в Италии сообщает, что 3-го апреля тяжелые бомбардировщики из состава средиземноморских воздушных сил союзников бомбардировали сортировочные станции и авиационный завод в Будапеште (столица Венгрии).

4 апреля мощные соединения авиации союзников бомбили военные об'екты в Бухаресте. Это был первый за время войны крупный воздушный налёт англо-американской авиации на румынскую столицу.

5 апреля соединения американских бомбардировщиков совершили налёт на нефтяной район Румынии—Плоешти. Налётом причинены большие разрушения сортировочной станции и нефтеочистительным предприятиям. Бомбами были подожжены автоцистерны. Кроме того, произошли большие взрывы в районе, где находятся нефтехранилища и завод, производящий боеприпасы. Из 120—150 поднявшихся в воздух истребителей противника сбито более 40.

Рэдкалегія.

Дзяржаўная бібліятэка БССР ім. У. І. Леніна
05/09
468